

# ЗА ТЫХ, ХТО РАТАВАЎ НАС АД СТРАШЭННАЙ БЯДЫ

20 гадоў мінула пасля чарнобыльскай катастрофы.

Мітынг-рэквіем у памяць аб гэтай цяжкай для нас часіне адбыўся ўчора ў сталіцы ля сцен храма ў гонар іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць». Зранку ў храме адбыліся ўрачыстая літургія і малебен. Да каменя памяці ахвяр і герояў чарнобыльскай катастрофы ў парку Дружбы народаў ускладзены вянкі і кветкі. Сюды прыйшлі гараджане, прадстаўнікі раёнаў Мінска, людзі, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі аварыі, госці сталіцы.

Падчас жалобнага мітынгу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Генадзь Нявыглас усклаў вянок ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і адзначыў, што за 20 гадоў пасля аварыі распрацаваны і праведзены ў жыццё тры дзяржаўныя праграмы па пераадоленню наступстваў катастрофы. На рэалізацыю іх выдзелена звыш 17 мільярдаў долараў. А пасля афіцыйных мерапрыемстваў удзельнікі ліквідацыі аварыі сабраліся, каб выпіць кілішак за тых, хто застаўся жывым, і за загінулых, што ратавалі нас ад страшэннай бяды.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара.

Рэха балючай бяды

# ЧАРНОБЫЛЬ: ЯК ЯНО БЫЛО

**Субяседнікі — Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай прэміі, акадэмік Мікалай Аляксандравіч БАРЫСЕВІЧ і дырэктар Інстытута радыяцыйнай бяспекі «Белрад», член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі Беларусі Васіль Барысавіч НЕСЦЯРЭНКА**

***(Працяг. Пачатак у нумары за 26 красавіка.)***

Каб сабраць дадатковыя матэрыялы, я папрасіў супрацоўнікаў інстытуцкай перасоўнай лабараторыі праехаць вакол Мінска па кальцавой дарозе, наведаць шэраг мікрараёнаў і зрабіць радыяметрычныя замеры. А сам зазірнуў на цэнтральны гарадскі рынак. Усюды ішоў бойкі гандаль прадуктамі — на адкрытых прылаўках, без усякіх абмежаванняў. А ў гэты час з неба сыпаўся радыеактыўны пыл!

У прыёмнай ЦК мне паведамілі, што зараз у М.М. Слюнькова кіраўнік Саюза пісьменікаў Н.С. Гілевіч. У Мінску пачаў работу чарговы з'езд пісьменнікаў і важна было абмеркаваць некаторыя праблемы развіцця літаратуры. Мне тады яшчэ падумалася: пры такіх адносінах да жахлівай трагедыі, можа стацца так, што не будзе каму чытаць гэту літаратуру...

Мой падрабязны даклад М.М. Слюнькову пра аварыю на ЧАЭС і магчымых маштабах наступстваў для Беларусі ніякага ўражання на яго не зрабіў. Ён зноў паўтарыў, што нічога страшнага няма: агонь патушылі, ідуць аднаўленчыя работы. Не трэба ўзнімаць паніку. І адправіў мяне да М.В. Кавалёва, старшыні Савета Міністраў Беларусі і адначасова старшыні грамадзянскай абароны рэспублікі.

У кабінеце М.В. Кавалёва былі ўжо намеснік старшыні ўрада Н.М. Мазай, міністр аховы здароўся М.Е. Саўчанка, начальнік штаба грамадзянскай абароны, генерал-маёр А.Л. Грышагін, Галоўны санітарны ўрач Піўчанка, старшыня Мінгарвыканкама Н.І. Міхасёў. На стале ляжалі разгорнутыя ваенныя карты са стрэлкамі распаўсюджвання радыяцыі.

— Ну што вы нам хочаце паведаміць? — з прыкметным раздражненнем сустрэў мяне М.В. Кавалёў.

Я паўтарыў усё тое, што нядаўна сказаў М.М. Слюнькову: і пра маштабы аварыі, і пра яе магчымыя наступствы для жыхароў Беларусі, і пра неабходнасць падрабязнай радыяцыйнай разведкі, медыцынскай ацэнкі бяспекі людзей, што пражываюць на поўдні рэспублікі. Асабліва падкрэсліў неабходнасць ёднай прафілактыкі як першачарговай ахоўнай меры здароўя людзей. Справа ў тым, што галоўны інжынер нашага інстытута напярэдадні пабываў у Галоўнага санітарнага ўрача горада і пераканаў яго падрыхтаваць 700 кілаграмаў ёднага раствору для таго, каб увесці яго ў пітную ваду на станцыях хларыравання, а ў малако — на малаказаводах. Але для гэтага патрабавалася рашэнне старшыні грамадзянскай абароны рэспублікі.

Выслухаўшы мяне, М.В. Кавалёў з усё тым жа раздражненнем сказаў, што ўрад рэспублікі з узнікшымі праблемамі разбярэцца сам, а мне параіў вярнуцца ў інстытут і заняцца сваімі справамі.

<u>**БАРЫСЕВІЧ М.А.:**</u>

— Цяпер я раскажу, што было зроблена па лініі Акадэміі навук. Яшчэ 28 красавіка, як толькі мне пазваніў Васіль Барысавіч з Масквы і далажыў пра аварыю на Чарнобыльскай АЭС, мы неадкладна сабралі прэзідыум у вузкім саставе, без запрашэння дырэктараў акадэмічных інстытутаў, і сталі думаць, якія прыняць захады. Але ні ў кога ніякай інфармацыі не было і мы вырашылі дачакацца прыезду Несцярэнкі. Адно што зрабілі — усім супрацоўнікам рэкамендавалі прыняць ёдную прафілактыку і як мага менш знаходзіцца на адкрытым паветры, асабліва дзецям.

30 красавіка мы сабралі прэзідыум зноў. Калі Васіль Барысавіч дакладваў аб маштабах і наступствах чарнобыльскай катастрофы, ён не змог стрымацца ад слёз. Стала зразумелым: вялікая бяда прыйшла ў наш край, прыйшла ўсур'ёз і надоўга.

Рашэннем прэзідыума АН БССР мы стварылі рабочую групу пад маім кіраўніцтвам, якая занялася выпрацоўкай канкрэтных, навукова абгрунтаваных мераў барацьбы з радыяцыйнай небяспекай. Акрамя супрацоўнікаў Інстытута ядзернай энергетыкі, у гэту групу ўвайшлі таксама вядучыя спецыялісты Белдзяржуніверсітэта і політэхнічнага інстытута.

Наша галоўная задача, як мы тады разумелі, заключалася ў тым, каб арганізаваць пастаяннае і аб'ектыўнае вымярэнне радыеактыўнага забруджвання на тэрыторыі рэспублікі і выпрацаваць рэкамендацыі па эфектыўнай засцярозе людзей.

Аднак паўстала праблема: чым праводзіць вымярэнні? Высветлілася, што дазіметрычнай апаратуры ў рэспубліцы было мала. З дзесятак прыбораў у Інстытуце ядзернай энергетыкі, ды столькі ж у іншых інстытутах. Гэта — кропля ў моры.

З дапамогай нашых вучоных і вядучых інжынераў сталічных прадпрыемстваў мы ў самыя сціслыя тэрміны арганізавалі зборку дазіметраў. Чатыры тысячы прыбораў прыслала Масква. Усё гэта дало магчымасць ужо ў першай палове мая забяспечыць неабходнай вымяральнай апаратурай значную колькасць малочных і мясных камбінатаў рэспублікі.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

***(Заканчэнне будзе.)***